Як запавет гучаць словы Алеся Бадака, ураджэнца в. Туркі Ляхавіцкага раёна: «Вельмі шкада, што ты ні разу не пабываў у гэтым ціхім куточку беларускай зямлі. А ты абавязкова палюбіў бы яго. Палюбіў бы задумлівы гарадок з нягучнаю назваю Ляхавічы. Палюбіў бы сціплыя, мудрыя вёсачкі з тутэйшымі шчодрымі і працавітымі людзьмі. Бо шчодрасць і працавітасць на гэтай зямлі перадаюцца ў спадчыну з пакалення ў пакаленне... так будзе і надалей, пакуль не перавядзецца апошні род маіх гасцінных і шчырых землякоў» [2].

Радкі Алеся Бадака міжволі наводзяць на думкі: якое месца ў творчасці паэтаўземлякоў займае тэма малой радзімы? А ці ўмеем мы любіць і шанаваць сваю ма-

лую радзіму? З гэтай мэтай намі быў праведзены аналіз творчасці паэтаў Ляхавіччыны, яе выхаваўчага патэнцыялу. Даследчая праца вялася ў наступных напрамках:

1. Малая радзіма — асноўная тэма ў творчасці паэтаў Ляхавіччыны.
2. Вобраз маці — неад'емная частка вобразу малой радзімы.
3. Вобразы роднай прыроды ў паэтычнай спадчыне Ляхавіччыны.
4. Выяўленча-мастацкія сродкі, якія дапамагаюць раскрыць тэму малой радзімы.

**Малая радзіма — асноўная тэма ў творчасці паэтаў Ляхавіччыны.**

Радзіма... Айчына... Таямнічы, але жывы арганізм, абрысы якога мы не можам выразна для сябе вызначыць, але непарыўна з ім звязаны. Менавіта Радзіма надзяліла нас здольнасцю думаць, адчуваць, дала нам мову, літаратуру.

Якое слова светлае — Радзіма!
Пяшчотна для мяне яно гучыць.
Без той зямлі, якая нарадзіла,
Нідзе, напэўна б, не змагла я жыць [3, с. 4].

Так пачынае свой роздум пра малую радзіму ў паэтычным зборніку «Святло душы» Вера Дыдышка. «У гэтых вершаваных радках яна ўся. Нераўнадушная, улюблёная ў жыццё, у зямлю, на якой нарадзілася і жыве, у людзей. Вера Дыдышка... не проста таленавіты паэт... — яна патрыётка хлебных ніў, валошкава-рамонкавых палян, яблыневай квецені, празрыстых крыніц, буслінага клёкату...» [4, с. 1].

У лірычнай спадчыне Ляхавіччыны тэма малой радзімы — гэта светлая крыніца, якая нясе ў сэрцы чытачоў любоў да роднага краю, дзе ён раскрываецца перад чалавекам, з захапленнем спасцігаецца ўпершыню. Як вынік, услед за першым адчуваннем малой радзімы прыходзіць любоў да вялікай Айчыны.

...Як добра жыць на гэтым свеце,
Калі такі куточак ёсць,
Каторы нас люляў і песціў
І адкрываў нам прыгажосць
Зямелькі беларускай роднай... [3, с. 9—10].

Вершы нашых паэтаў-землякоў — трапяткі аповед пра ляхавіцкую зямлю, якую творцы бачаць па-рознаму, кожны пасвойму. Аднак, пра што б ні пісалі ў сваіх вершах паэты (пра поры года, пра музыку і фарбы нашых родных прастораў), яны заўсёды думалі і неслі чытачам галоўнае — любоў да роднага краю.

Ляхавічы — мой мілы куточак...
...Ты — ёсць часцінка маёй Беларусі,
Дзе я нарадзіўся, жыву.
Табой я па праву заўжды ганаруся... [5, с. 20].

Гэтыя радкі дыхаюць любоўю да роднай зямлі і людзей, напоўнены самымі светлымі пачуццямі да малой радзімы.

Як прывітанне землякам у вершаваныя радкі паэтаў Ляхавіччыны ўплецены знаёмыя кожнаму жыхару нашага раёна назвы: «...Цячэ каля Ліпска рачулка Ліпнянка...» (Вера Дыдышка, «Ліпнянка»), «...Цудоўны мой горад вясною, // Як кветка ўвесь расцвітае... // Ляхавічы — краса беларускага краю» (Вячаслаў Вайшэвіч, «Ляхавічы»).

Для Алеся Бадака тэма малой радзімы з'яўляецца асноўнай танальнасцю яго творчасці. Любоў да роднага краю, родных мясцін для лірычнага героя ў вершах А. Бадака — святое пачуццё:

Заўсёды знаю, дзе, калі не буду,
Куды я ні паеду, я кругом
Ніколі сваю вёску не забуду
І сэрцу дарагі бацькоўскі дом [6, с. 45].

Як бы ні прыцягваў цяперашні час, як бы ні абнадзейвала будучыня, успаміны чалавека маюць над ім значна большую ўладу. А вяртанне на сваю радзіму — учынак сапраўднага патрыёта. У вершы «Край свету» аўтар выказвае шчырыя і ўзвышаныя пачуцці да месца, дзе нарадзіўся і вырас, дзе пакахаў упершыню:

О родны кут любові і журбы!
Я без яго
У свеце заблудзіўся,
Вярнуўся —
нібы зноўку нарадзіўся,
Успомніў, як даўно я тут не быў.
І ўжо на ўсё астатняе забыўся... [6, с. 81—83].

У вершы «Толькі з табою» лірычны герой Вячаслава Вайшэвіча прызнаецца Ляхавічам ў любові, з упэўненнасцю сцвярджаючы, што «...лепшага краю не знаю, // Тут я нарадзіўся і рос...», а таксама робіць для сябе вельмі важную жыццёвую выснову: «І дзе не бываў на прасторах, // Ды толькі цягнула назад», бо «...мой край — гэта цуд на планеце. // А лепшае? Ты пашукай» [5, с. 28].

Вера Дыдышка — паэт вясковых каранёў і крыві, любіць сваё роднае сяло. Пра яго, як пра самое дарагое і блізкае, аўтар піша:

Дзень добры, Ліпск, мая калыска,
Мая найпершая любоў!
Далёка я жыву ці блізка,
А да цябе спяшаю зноў [2].

Сваёй творчасцю, любоўю да роднага краю ляхавіцкія паэты яскрава даказваюць, што ў кожнага чалавека ёсць роднае і блізкае месца, дзе ён адчувае сябе спакойна і нязмушана.

Такім чынам, у выніку аналізу твораў мы можам зрабіць наступныя высновы:

1. Паэтаў Ляхавіччыны аб’ядноўвае любоў да радзімы.
2. Тэма малой радзімы, яе людзі сталі прадметам самых глыбокіх роздумаў, сардэчнай прыхільнасці ў паэзіі ляхавіцкага рэгіёна.
3. Паэзія ляхавіцкіх аўтараў глыбока патрыятычная: яна перадае нам чыстую, узнёслую любоў да Радзімы, сваю незвычайную шчырасць і чалавечнасць.

**Вобраз маці — неад’емная частка вобразу малой радзімы.**

Малая радзіма для паэта — гэта не толькі родны дом, сяло, але, у першую чаргу, родныя, блізкія людзі, якія жывуць побач з ім. Самым дарагім чалавекам, вобраз якого адразу паўстае ў памяці пры слове Радзіма, з’яўляецца маці.

...Як добра жыць, калі жыве матуля...
...Ніколі нас у горы не пакіне
Сагрэты яе сэрцам родны дом.
І самыя прыгожыя вяргіні
Растуць толькі пад маміным акном [3, с. 16].

Гэтымі радкамі Вера Дыдышка сцвярджае, што ўспрыманне непаўторнасці і харазтва малой радзімы для чалавека напрамую звязана з маці і святло ў акне бацькоўскай хаты да таго часу мілае і прыветлівае, пакуль «...Чутна, як на вялікай Зямлі // Сэрца матчына б’ецца».

У вершы «Вышыванкі» вобраз маці — гэта родны край, яблыні і вішні ў садзе, рака, духмяны луг — усё тое, што носіць назву Радзіма:

У мамінай хаце ад самага ранку
Зімою і летам цвітуць вышыванкі...
...Усе кветкі любімыя роднага краю
На маміных я вышыванках пазнаю! [3, с. 22—23].

Таму лірычны герой імкнецца ў родныя мясціны, каб зноў апынуцца каля родных веснічкаў, адчуць «маміны... дзівосныя рукі»:

Далёка ад дому сустрэнем заранку,
А вернемся ўсе мы да роднага ганку [3, с. 22—23].

Творчасць ляхавіцкай паэтэсы Веры Дыдышка з’яўляецца пацверджаннем таго, што з вобразам маці звязана ўсё самае дарагое для душы чалавека, у тым ліку і наша малая радзіма, дзе мама падарыла нам жыццё, навучыла размаўляць, запаліла ў сэрцы вечнае святло роднага слова, дзе «...бяліла палотны-дарогі // І расцілала на мяккай траве».

У творчасці Алеся Бадака вобраз маці таксама звязаны з тэмай вяртання на радзіму:

А я хаджу па свеце,
Ды прыцягненне сэрца,
Твайго, матуля, сэрца,
Вяртае ўсё ж дамоў [2].

Удалыя радкі верша значна ўзмацняюць духоўны ўрок твора, нагадваючы кожнаму пра нешта сваё, схаванае ў душы і вельмі дарагое, — повязь матулі і роднага краю.

Як бачым, у вершах ляхавіцкіх паэтаў адчуваецца непарыўная сувязь вобраза маці з тэмай малой радзімы, а паэтычная

спадчына Ляхавіччыны праз выхаванне павагі да матулі спрыяе фарміраванню любові да роднага краю.

**Вобразы роднай прыроды ў паэтычнай спадчыне Ляхавіччыны.**

Тое месца, дзе мы нараджаемся, з'яўляецца для кожнага адметным, са сваімі краявідамі, абрысамі і выявамі. І на ўсё жыццё малая радзіма застаецца самай роднай і цудоўнай, дарагой і блізкай.

Пра прыгажосць і незвычайнасць роднай зямлі, пра любоў да яе ў сваіх пейзажных замалёўках гаворыць Вячаслаў Вайшэвіч. Ён з дзяцінства жыве з ёй у адзінстве, таму і радкі яго вершаў надзелены душэўнасцю: «...люблю пабыць у родным краю... // Дзе пазнаваў жыццё і шчасце, // І слухаў гоман звонкіх кос, // Прыроды рух у вечнасць бачыў», «...край мой мілы і прыгожы, // Дзе ўсё здаецца непаўторным», «...Прайсціся марудна і скора, // Заглянуць у свой палісад, // Дзе кветкі найлепшыя ў свеце, // А яблык — цудоўны нектар» [5, с. 7, 43—44].

Прырода і чалавек у вершах паэта знітаваны ў адно, кожная дэталь, якая ўвабрала ў сябе прыгажосць роднай зямлі, выклікае пачуццё захаплення...

Верш «Кола» Алеся Бадака пра родныя мясціны глыбока лірычны і прымушае ў хуткай плыні часу задумацца аб жыцці. Аўтар стварае яркі вобраз радзімы, вельмі тонка адчуваючы гармонію ў прыродзе: «песня жаўранка», «шэпт таполі», «водар бэзу», «гул чмяля», «голас маці», «пах травы». Але адценне трагедыйнасці, горычы і тужлівасці душы мы можам адчуць у наступных радках: «Мы ідзём. // Мы спяшаемся вечна. // А за намі — ціш эй, радзей — // Пах травы і парыпванне весніц // Патанаюць у шуме падзей» [6, с. 63].

Радкі паэта гучаць як папярэджанне кожнаму чалавеку пра неабходнасць прыпыніцца на хвіліну і ўспомніць вобразы роднага краю, каб тыя не сталі «бяспамяцтва нашага» знакам.

Пра прыгажосць роднай яе сэрцу ракі ў вершы «Ліпнянка» гаворыць і Вера Дыдышка: «Цячэ каля Ліпска рачулка Ліпнянка, // Хаваецца ў зелені ціхіх лугоў». Аўтар верша паказвае значэнне рачулкі ў яе жыцці: «...Жаданні, пачуцці, надзеі, трывогі — // Усё каля рэчкі Ліпнянкі жыве» [3, с. 8].

У працэсе даследавання творчасці ляхавіцкіх паэтаў мы пераканаліся, што іх паэзія — цудоўны, выдатны, непаўторны свет. А цэнтральным вобразам лірыкі мясцовых паэтаў стаў родны край — месца дзяцінства, юнацтва, творчага станаўлення.

Улічваючы вышэйсказанае, прыходзім да наступных высноў:

1. Тэма малой радзімы паэтаў Ляхавіччыны непарыўна звязана з тэмай роднай прыроды.
2. Пейзажныя замалёўкі прасякнуты глыбокай і пяшчотнай любоўю да роднага краю, роднай зямлі. Яны захапляюць нас сваёй прыгажосцю, дораць радасць зносін з прыродай, запаўняюць душу гармоніяй і спакоем.

**Выяўленча-мастацкія сродкі, якія дапамагаюць раскрыць тэму малой радзімы.**

Каб стварыць жывыя, адухоўленыя вобразы роднага краю, блізкія чытачам, ляхавіцкія паэты выкарыстоўваюць розныя паэтычныя тропы. Метафары («маленства вартавыя вербы», «калыска светлых мар», «рэчка Ліпнянка праз сэрца маё ўсё цячэ і цячэ», «сагрэты сэрцам родны дом»), эпітэты («родная, ласкавая зямля», «мілы краявід», «родная старонка», «маміны, дзівосныя рукі», «кветкі любімыя роднага краю»), параўнанні («мой край — гэта цуд на планеце», «Ліпск, мая калыска», «Ляхавічы — краса беларускага краю»), увасабленні («буслiны клёкат вітае раніцу вясны», «старая вішня дрэмле», «рачулка хаваецца ў зелені ціхіх лугоў», «вярба зялёнаю сукенкай пад вокны выйшла пафарсіць») дапамагаюць вобразам Ляхавіччыны стаць яркімі, запамінальнымі.

Дзякуючы гэтым мастацкім прыёмам выявы ляхавіцкай зямлі ўспрымаюцца як жывыя, здольныя спачуваць і суперажываць чалавеку ў яго радасцях і смутку, зліваецца з яго пачуццямі і перажываннямі.

Можна з упэўненасцю сказаць, што паэтычная спадчына Ляхавіччыны — гэта духоўнае багацце ляхавіцкай зямлі. Вершы ляхавіцкіх паэтаў утрымліваюць найбагацейшы матэрыял, які дазваляе выхоўваць любоў да малой радзімы. Іх можна

выкарыстоўваць на ўроках літаратуры, пры правядзенні пазакласных мерапрыемстваў, на класных і інфармацыйных гадзінах, школьных вечарынах, падчас краязнаўчай дзейнасці.

Намі былі праведзены мерапрыемствы, накіраваныя на азнаямленне з жыццём і творчасцю паэтаў г. Ляхавічы і Ляхавіцкага раёна, папулярызацыю іх паэзіі: сустрэчы з паэтамі Ляхавіччыны, літаратурныя вусныя часопісы «Паэзія на вечным шляху», «Любіць Айчыну — гэта многа: па старонках кніг Алеся Бадака», конкурс чытальнікаў «Ніколі сваю вёску не забуду і сэрцу дарагі бацькоўскі дом».

Для таго, каб паказаць навучэнцам, наколькі шматгранна і паэтычна ў творчасці паэтаў-землякоў адлюстраваны вобразы роднай прыроды, праведзены завочная экскурсія «Знаёмыя сэрцу мясціны» з прэзентацыяй ляхавіцкіх краявідаў, літаратурная замалёўка «Вербы ля чыстай вады», падчас якой дзеці пераканаліся, што вобразы ляхавіцкай прыроды знайшлі сваё адлюстраванне ў паэзіі. Пад дэвізам «Без той зямлі, якая нарадзіла, нідзе, напэўна б, не змагла я жыць» быў арганізаваны краязнаўчы велапаход па родных мясцінах Веры Іосіфаўны Дыдышка.

У В. П. Астаф'ева ёсць выключна трапныя словы: «Калі ў чалавека няма маці, няма бацькі, але ёсць радзіма — ён яшчэ не сірата. Усё праходзіць: каханне, шкадаванне пра яго, горыч страт, нават боль ад ран праходзіць, але ніколі-ніколі не праходзіць і не тухне туга па Радзіме... Радзіма — гэта ўсё: і перш за ўсё мова, прырода, старажытная гісторыя сваёй краіны, яе святы, памяць пра продкаў і павага да бацькоў, а галоўнае — праца, творчая, стваральная праца, праца ў імя сваёй краіны, свайго народа» [2].

І, мабыць, не лішнім напамінаннем стануць наступныя высновы:

1. Для кожнага з беларускіх паэтаў малая радзіма — гэта перш за ўсё родны горад ці сяло, сям'я, сябры, навакольная прырода.
2. Паэзія нашых землякоў наводзіць на глыбокія маральна-філасофскія разважанні, дае магчымасць угледзецца ў сваё жыццё, паглыбіцца ў тое, што адбываецца вакол, зразумець сваё прызначэнне.
3. Паэты, здольныя пераконваць, растлумачваць, фарміраваць светапогляд чалавека, дазваляюць убачыць прыгожае побач, выхоўваюць любоў да роднай зямлі, сваёй творчасцю дапамагаюць людзям стаць духоўна багацейшымі.
4. Паэты Ляхавіччыны з'яўляюцца сапраўднымі патрыётамі, вернымі сваёй Айчыне. У іх творах адлюстравана бясконцая любоў да малой радзімы.

У заканчэнне хочацца ўспомніць словы ветэрана педагагічнай працы Востраўскай сярэдняй школы Ляхавіцкага раёна Алены Емяльянаўны Май:

Бяражыце зямлю,
Заставайцеся, людзі,
На бацькоўскай зямлі і далей
працаваць.
Каб жыццём даражылі,
Сваю вёску любілі
І традыцыі нашы маглі захаваць.


1. Новости Беларуси. Белорусское Телеграфное Агентство: Годом малой родины объявлен 2018 год в Беларуси [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://belta.by/president/view/godom-maloj-rodiny-objjavlen-2018-god-v-belarusi-288746-2018. — Дата доступа: 24.02.2019.
2. Государственное учреждение культуры «Ляховичская районная централизованная библиотечная система» : Літаратурная Ляхавіччына [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://liblh.by/kraevedcheskie-bazy-danyx/litaraturnaya-lyaxavichchyna. — Дата доступа : 10.02.2019.
3. *Дыдышка, В.* Святло душы : зб. вершаў / В. Дыдышка. — Мінск : Медысонт, 2002. — 96 с.
4. *Барадзіна, В.* Святло душы / В. Барадзіна // Ляхавіцкі веснік. — 2010. — № 80. — 20 кастр. — С. 1.
5. *Вайшэвіч, В.* Заўсёды побач : зб. вершаў / В. Вайшэвіч. — Мінск : Маст. літ., 2013. — 108 с.
6. *Бадак, А.* Маланкавы посах : кн. лірыкі / А. Бадак. — Мінск : Маст. літ., 2004. — 133 с.


*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 21.05.2019.*

# Проблемы и перспективы профориентационной деятельности в контексте анализа зарубежного опыта

**А. Н. Дударев,**
старший преподаватель кафедры анатомии и физиологии
Витебского государственного университета имени П. М. Машерова,
**Е. Я. Аршанский,**
профессор кафедры химии
Витебского государственного университета имени П. М. Машерова,
доктор педагогических наук, профессор

Сегодня практически во всех образовательных учреждениях проводятся мероприятия по профессиональной ориентации, в ходе которых учащимся помогают определиться с профессиональными предпочтениями и сделать свой осознанный выбор будущей деятельности. В эти программы постепенно включаются работодатели и высшие учебные заведения, которые предлагают помощь в организации различных видов профориентационных мероприятий, например, экскурсий на предприятия или встреч с интересными людьми в вузе. Важнейшим документом, определяющим систему профориентационной работы в нашей стране, является Концепция развития профессиональной ориентации молодёжи в Республике Беларусь [4].

Современная молодёжь выбирает профессию с точки зрения авторитетности и будущего финансового благополучия, не всегда опираясь на реальный спрос в экономике и собственные личностные и профессиональные качества. Поэтому профориентационная деятельность в учреждениях высшего образования должна быть направлена не только на выбор конкретной специальности абитуриентом, но и на формирование у него важных компетенций, личностных качеств, позволяющих реализовать себя в общественной и производственной сферах.

Ежегодно из-за неудачного выбора специальности в Республике Беларусь из вузов отчисляются по собственному желанию до трёх процентов студентов, а тысячи выпускников после распределения меняют вид деятельности. По статистическим данным 2018 года в предшествующем году направление на работу получили 26 тысяч выпускников, которые подлежали распределению, из них прибыли к месту работы 23,4 тысячи человек (89,8 %). Экономические потери нашего государства в результате смены профессий и длительного периода адаптации молодых специалистов составляют ежегодно миллионы долларов [7].

Авторам близко определение профориентации, которое дал Е.А. Климов. Профориентацию он рассматривает как совокупность психолого-педагогических, медико-социальных, экономических про-

цессов, цель которых состоит в формировании профессионального самоопределения, соответствующего индивидуальным особенностям каждой личности и запросам общества в кадрах [2].

Аналогом термина «профессиональная ориентация» в западных странах является словосочетание «развитие карьеры» (career development). Для большинства из них характерна организация многолетнего, постоянного наблюдения за успехами и личностными особенностями учащихся, составление своеобразного досье и анализ этих данных при отборе абитуриентов для продолжения обучения в колледже или университете [5].

Опираясь на данные ряда исследований [1; 3; 5; 6; 10], нами был проведён анализ опыта организации профориентационной работы в ряде европейских стран, США и Республике Беларусь, результаты которого представлены в таблице 1. На основе этих данных можно констатировать, что развитие профориентации в Евросоюзе и США опирается на сходные методы и формы. Главной её задачей выступает оказание помощи учащимся в осознанном выборе будущей профессии с опорой на личные предпочтения и психологические склонности, а удовлетворение потребности государства и рынка труда в квалифицированных, конкурентоспособных кадрах уходит на второй план. У обучающихся есть возможность освоить адаптационные образовательные программы, спецкурсы и факультативы. Замечена тенденция: чем выше в государстве уровень дохода на душу населения, тем раньше начинается профориентационная работа, разработана законодательная база, осуществляется специальная подготовка профконсультантов.

Специалисты в области развития карьеры постепенно отошли от мультипрофильных тестов. После 2010 года эти методы в работе профконсультанта обычно дополняются разработкой проектов или диалогом (сочинением, подробным интервью абитуриента). Учреждения образования всё чаще признают, что они несут ответственность за руководство обучаемыми не только в плане их академического роста, но и в развитии карьеры. Сегодня особое внимание уделяется устойчивому общению между обучаемыми и профконсультантами или преподавателями, созданию портфолио на каждого учащегося [9].

Например, в Нидерландах для изучения взаимосвязи между учебной средой и наличием профессиональных компетенций было проведено исследование среди 3 499 учащихся и 166 учителей в 34 школах страны. Учитывались следующие аспекты учебной среды: используемые методы профориентации, применяемые инструменты и степень практической направленности учебной программы. В исследовании выделены три карьерные компетенции: карьерная рефлексия (рефлексивное поведение), карьерное становление (проактивное поведение) и сетевое взаимодействие (интерактивное поведение), а также рассматривается, какие аспекты образовательной среды, направленные на содействие профессиональному обучению, способствуют развитию карьерных компетенций у учащихся (в возрасте 12—19 лет), обучающихся в системе довузовского и среднего профессионального образования [10].

Результаты исследования показали, что профориентация, в ходе которой происходит диалог с учащимся о его конкретных настроениях, чувствах и т. д., ориентирующая его на будущее в профессии, в наибольшей степени способствует наличию у обучаемых карьерных компетенций. Без этого диалога методы и инструменты профессиональной ориентации не способствуют должным образом приобретению профессиональных качеств. Также важна позитивная беседа с экспертами в области конкретных профессий.

Исследование, проведённое в 14 группах американских учащихся, также продемонстрировало, что диалог для развития карьерных компетенций является более действенным, чем стандартные методы диагностики [8].

Право на получение общего среднего образования в Республике Беларусь

**Таблица 1. — Тенденции в осуществлении профориентационной работы**

| Характеристика | Страна | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | **США** | **Франция** | **Великобритания** | **Швеция** | **Беларусь** |
| Период профориентации | 5 —14 лет — начальная информация о профессиях, анализ возможностей, стажировки. 15—19 лет — выбор конкретной специальности, погружение в профессию | 6 — 10 лет — знакомство с профессиями. 13 — 16 лет — включение обучающихся в моделируемую будущую профессиональную деятельность | 5 — 11 лет — общее наблюдение за учащимися. 11 — 16 — развитие самостоятельности, освоение специальностей. С 16 лет до устройства на работу — проба в профессии | 6 — 10 лет — получение представлений о многообразии профессий. Особое внимание уделяется профориентации в средних и старших классах | 5 — 10 лет — знакомство с профессиями. 11 — 14 лет — популяризация рабочих специальностей, формирование позитивного образа человека труда. С 15 лет — выбор сферы труда и профапробация |
| Программы профессиональной подготовки и факультативы для школьников | «Программа трудовых отрядов», «Молодёжь строит», «Молодёжные стажировки», «Академия X», «От школы к работе» и другие. Способствуют подготовке к поступлению в колледж или переходу учащихся на рынок труда | Учебная дисциплина «Знакомство с профессиями». Программы, подготовленные Национальным бюро информации по образованию и профессии. Обучение в основном проводится на рабочем месте | Программа «Образование для карьеры». Гибкая система профориентации, позволяющая работодателю сделать заказ на индивидуальные учебные программы. Создание мини-предприятий в образовательных учреждениях | Программа «Куда шагать по жизненной лестнице». Освоение профессии или нескольких специальностей во время обучения и летней практики | Профессиональное самоопределение учащихся I—XI классов средствами системной профориентационной работы», «Выбирая профессию — выбираю будущее!» и другие программы. |
| Психолого-Профориентационная диагностика | Досье на учащегося, в котором учитываются 15 факторов (успеваемость, интересы, здоровье и др.). Дополнительное ведение проектов или подробное интервьюирование учащегося | Мульти-профильное тестирование. Портфолио на каждого учащегося (личностные особенности, его внешкольные занятия и увлечения и др.). Самоопределение учащихся | Диалоговая форма работы, накопление данных об учащемся, применение разнообразных тестов (включая компьютерные), профориентация во время занятий, психологические тренинги | Психологическая диагностика профессиональной направленности личности; семейное консультирование по вопросам профессионального самоопределения старшеклассников, ознакомление школьников с различными видами труда и профессиями | Индивидуальное психологическое консультирование учащихся; психолого—педагогическая диагностика, коррекция личностного развития в будущей профессиональной деятельности |

*Окончание таблицы 1*

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Роль центров Профориентации и консультирования | Профессиональную консультацию осуществляет служба «Career Guidance» (Руководство карьерой) (сбор информации об учащемся, содействие выпускникам при трудоустройстве, сбор данных об их дальнейшей судьбе) | 500 центров информации и ориентации (под эгидой Министерства национального образования), работа профсоветников | Центры в каждой школе, колледже и вузе. Совмещение профориентационных услуг и помощи по трудоустройству | Сотрудничество с частными предприятиями по трудоустройству учащихся, использование общедоступных банков данных с полной информацией по профессиям и ситуации на рынке труда | Центры по Профориентации. Используются специальные справочники, созданы сайты для абитуриентов по специальностям, профориентир, возможно консультирование в школе |
| Законодательная база | Законы «О стимулировании профконсультирования в начальной школе» (1981 г.), «О совместной профессиональной подготовке» (1982 г.) | Законы «Об ориентации» (1989 г.), «О профессиональном образовании» (1992 г.), | Закон «О службах профориентации для учащихся» (1973 г.) | Закон «Об обязательной регистрации свободных рабочих мест» и др. | «Кодекс Республики Беларусь об образовании» (2011 г.), Концепция развития профессиональной ориентации молодёжи в Республике Беларусь (2014 г.) |
| Подготовка Профконсультантов | Педагогическая магистратура (стаж работы по специальности не менее двух лет и с хорошим отзывом с места работы). Дополнительная подготовка (частные и государственные профконсультанты) | Подготовка профсоветников осуществляется в пяти институтах. Срок обучения бакалавров — два года, для выпускников гуманитарного факультета вуза — один год | Диплом профсоветника получают после специального обучения лица, окончившие университет и имеющие определённый практический опыт в этой области | Педагогический университет в Мальме. Предпочтение отдаётся имеющим педагогический стаж. Консультант посещает школу не реже двух раз в месяц | Профориентация проводится работниками педагогического коллектива (классным руководителем, психологом и др.), а также представителями учреждений высшего и среднего специального образования постоянно или по мере необходимости |

гарантировано каждому гражданину. Воплотить его в жизнь позволяет существующая в государстве система образования, которая включает общее базовое образование, общее среднее образование, профессионально-техническое образование, среднее специальное образование, высшее образование.

Рассмотрим оригинальную систему профориентационной работы с учащимися, которая создавалась с опорой на анализ отечественного и зарубежного опыта на биологическом факультете Витебского государственного университета имени П. М. Машерова. Этот вид деятельности постоянно пополняется новыми, современными формами — участием в различных фестивалях (в республиканском фестивале молодёжной вузовской науки), выставках для учащихся (например, в рамках регионального этапа республиканского конкурса профессионального мастерства «III Национальный чемпионат WorldSkills Belarus 2018»), в образовательных проектах, международных экономических форумах («Инновации. Инвестиции. Перспективы»), в ярмарках вакансий выпускников. А при получении грантов для стажировок студентов применяется диалоговая форма работы с выпускниками.

Привлечение учащихся в творческую среду ВГУ имени П. М. Машерова происходит уже во II классе в рамках IT-академии (развиваем общую информационную грамотность, учим мыслить логически), с VI класса начинают работать школы юных биологов, химиков, психологов и т. д., где ребята знакомятся с основными характеристиками будущей профессии, овладевают профессиональными навыками. С X класса организуются различные курсы по предметам, учащиеся имеют возможность проводить исследования в специализированных лабораториях, а абитуриенты — почувствовать себя студентами в реальных условиях университета.

На сайте ВГУ http://www.vsu.by в разделе для абитуриентов размещена информация о днях открытых дверей и подготовительных курсах, приводятся контрольные цифры приёма, варианты вступительных испытаний для разных специальностей, демонстрируются проморолики и др.

Учебно-методические материалы по биологии и химии для привлечения абитуриентов и их обучения размещены в school.vsu.by. Цель данного ресурса — обеспечить двустороннее функционирование системы «Школа-вуз» on-line, стать площадкой для педагогических исследований и методической работы с учителями школ. Здесь же организовано разнообразное дистанционное обучение, например, в рамках летней химической школы для учащихся педагогических классов.

Специалистами вуза разработана основа для комплексной профориентации учащихся, которая включает в себя деятельность по направлениям, отражённым в таблице 2.

ВГУ имени П. М. Машерова в настоящее время практически готов к реализации модели «Университет 3.0». Учреждение образования не только занимается обучением и научными разработками, но и продвигает свои проекты в различных сферах экономики. Инновационная деятельность университета осуществляется в процессе функционирования учебно-научно-производственных комплексов (УНПК). На биологическом факультете их два — «Биотехнология» и «Экология».

В рамках первого УНПК действуют современные научно-исследовательские лаборатории. На их оборудовании студенты выполняют курсовые и дипломные работы, а выпускники готовят материалы для защиты магистерских и кандидатских диссертаций. В 2018 году кафедра химии ВГУ вошла в состав Союза «Медицина и фармацевтика — инновационные проекты» (кластер, созданный в фармацевтической отрасли Республики Беларусь).

В рамках второго УНПК — «Экология» — осуществляется оценка воздействия производства на окружающую среду. Учащиеся ведут учёт объектов растительного

**Таблица 2. — Основные формы и направления профориентационной работы на биологическом факультете ВГУ имени П. М. Машерова**

| Формы профориентационной работы | Направления профориентационной работы |
|---|---|
| Профессиональная пропаганда (профинформация и профагитация) | Организация дней открытых дверей университета и биологического факультета ВГУ имени П. М. Машерова;<br>постоянное обновление и распространение среди учащихся рекламных буклетов, флаеров, плакатов, презентаций, видеороликов, визиток и др.;<br>регулярное участие в работе школьных научных конференций и родительских собраний;<br>представление университета на ярмарках вакансий и конкурсах профессионального мастерства;<br>проведение с учащимися собраний и классных часов по профориентации в различных учреждениях образования Республики Беларусь |
| Предварительная профессиональная диагностика | Проведение профконсультационной беседы;<br>уточнение выбора специальности абитуриентом;<br>определение взаимосвязи требований, предъявляемых профессией к человеку, и личностных особенностей учащегося;<br>исследование профессиональных интересов и склонностей старшеклассников |
| Профессиональная консультация | Беседы о значимости будущей профессии и личностных качествах учащихся;<br>индивидуальные консультации по специальностям, которые проводятся экспертами и ответственными за профориентацию на факультете для родителей и учащихся;<br>профессиональные пробы с учащимися педагогических классов для привлечения их в профессию;<br>индивидуальная работа с учащимися по выбору профессии в рамках деятельности филиалов кафедр;<br>размещение разработанного профориентира для всех специальностей университета на сайте в разделе для абитуриентов |
| Предметная составляющая профориентационной подготовки учащихся | Организованы мастер-классы и вебинары, например, «Анализ типичных ошибок по биологии и химии на централизованном тестировании» в различных районах Витебской области;<br>разработаны обобщающие материалы по учебным предметам *биология, химия* и *география* для подготовки учащихся к вступительным испытаниям;<br>ежегодно проводятся олимпиады ВГУ имени П. М. Машерова по биологии, химии, географии;<br>организовано консультирование по биологии, химии, географии для подготовки абитуриентов дневной и заочной форм обучения к централизованному тестированию;<br>организована работа с учащимися в рамках межшкольного факультатива;<br>осуществляется постоянная подготовка учащихся к различным этапам Республиканской олимпиады по химии, биологии и географии |
| Профессиональное воспитание | привлечение учащихся в волонтёрскую группу общественных экологов «Экологический патруль»;<br>работа с абитуриентами в рамках учебно-научно-производственных комплексов «Биотехнология» и «Экология»;<br>развитие научного мышления, консультирование по проектам (секции «Экология», «Биология», «Химия», «География») для научно-практической конференции учащихся учреждений образования Витебской области «Эврика» и республиканского конкурса (конференции) работ исследовательского характера учащихся;<br>разработка и проведение на кафедре химии воспитательно-образовательного мероприятия для учащихся «Менделеевские среды» |

мира в условиях города, занимаются озеленением его территории, оценивают качество поверхностных вод, используют ГИС-технологии при исследовании городской среды. Налажено тесное сотрудничество с Витебской городской инспекцией природных ресурсов и охраны окружающей среды, с предприятиями области.

Ежегодно на расширенной коллегии Витебского областного комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды представителям волонтёрской группы общественных экологов «Экологический патруль» вручаются удостоверения «Общественный инспектор охраны природы». Лучшие студенты принимают участие в работе Московской международной летней экологической школы «Экологический мониторинг, моделирование и проектирование в условиях природных, городских и агроэкосистем».

И в заключение следует отметить, что используемые педагогами научные и практические разработки XX века по проблемам профориентации, профессионального самоопределения и развития карьеры во многом уже не актуальны. В связи с этим назрела необходимость поиска новых теоретико-методологических подходов, интерактивных технологий и форм организации профориентационной работы.


1. *Гриншпун, С. С.* Подготовка учащихся к жизни и труду в школах Швеции / С. С. Гриншпун // Педагогика. — 2007. — №3. — С. 71—78.
2. *Климов, Е. А.* Психология профессионального самоопределения : учеб. пособие / Е. А. Климов. — М.: Академия, 2007. — 566 с.
3. *Кондрашова, И. С.* Сопровождение профессиональной карьеры и трудоустройства выпускников: французский и отечественный опыт / И. С. Кондрашова, С. В. Жиркова // Социально-экономические явления и процессы. — 2013. — № 4 (50). — С. 77—82.
4. Концепция развития профессиональной ориентации молодёжи в Республике Беларусь [Электронный ресурс] : постановление Министерства труда и социальной защиты Республики Беларусь, Министерства экономики Республики Беларусь, Министерства образования Республики Беларусь, 31.03.2014 № 15/27/23. — Режим доступа : http://vgpl5.by/files. — Дата доступа : 29.03.2019.
5. *Лощилова, М. А.* Профориентация на старшей ступени общеобразовательной школы Великобритании как основа профессионального самоопределения / М. А. Лощилова, Е. В. Портнягина // Наука о человеке : гуманитарные исследования. — 2013. — № 2 (12). — С. 86—93.
6. *Морозова, М. В.* Профессиональная ориентация на старшей ступени общеобразовательной школы США как залог успешного профессионального самоопределения / М. В. Морозова // Профессиональное образование в России и за рубежом. — 2012. — № 8. — С. 31—34.
7. *Нестеров, А. П.* Система образования Республики Беларусь в цифрах / И. Д. Ажеронок, Н. А. Денищик, А. П. Нестеров. — Минск : Главный информационно-аналитический центр Министерства образования Республики Беларусь, 2018. — 64 с.
8. Career writing : Creative, expressive and reflective approaches to narrative identity formation in students in higher education / R. Lengelle [et al.]. — Journal of Vocational Behavior. — 2014. — Vol. 85. — P. 75—84.
9. *Kuijpers, M.* Professionalizing Teachers in Career Dialogue: Effect Study. Procedia / M. Kuijpers, F. Meijers. — Social and Behavioral Sciences. — 2014. — Vol. 116. — P. 82—87.
10. *Kuijpers, M.* The relationship between learning environment and career competencies of students in vocational education / M. Kuijpers, F. Meijers. — Journal of Vocational Behavior. — 2011. — Vol. 78. — P. 21—30.


*Материал поступил в редакцию 15.04.2019.*

# Пазакласная работа як сродак развіцця інтарэсу да біялогіі

**М. С. Белагаловая,**
настаўніца біялогіі і хіміі першай кваліфікацыйнай катэгорыі
сярэдняй школы № 23 г. Гродна

Кожны настаўнік накіроўвае ўсе свае намаганні на тое, каб навучэнцы хутка ўключыліся ў адукацыйны працэс, паспяхова засвоілі аб'ём неабходнай інфармацыі. Так, для выхавання цікавасці да прадмета настаўнікі біялогіі сярэдняй школы № 23 г. Гродна на працягу навучальнага года арганізуюць розныя мерапрыемствы, якія дазваляюць падкрэсліць прыгажосць роднай прыроды, а таксама паказаць шматграннасць навукі біялогіі.

Штогод у школе праводзіцца тыдзень біялогіі, хіміі, геаграфіі, мэта якога — развіццё творчых здольнасцей, мыслення, эрудыцыі вучняў. Кожны з іх мае магчымасць паказаць, на што здольны.

Зразумела, што, з аднаго боку, яго неабходна правесці на высокім прафесійным узроўні, а з другога — падрыхтаваць мерапрыемствы, якія не толькі адпавядаюць запытам навучэнцаў, але і будуць цікавымі, змястоўнымі, сучаснымі.

Так, напрыклад, вучні V—VIII класаў маюць магчымасць праявіць свае творчыя здольнасці ў стварэнні аб'ёмных муляжоў біялагічных, геаграфічных аб'ектаў, вырабаў з прыроднага матэрыялу, навучэнцы VII—VIII класаў — паказаць трывалыя веды пры выкананні алімпіядных заданняў, падрыхтаваных для іх настаўнікамі.

Правядзенне першага этапу рэспубліканскай алімпіяды па біялогіі, хіміі, геаграфіі для IX—XI класаў дазваляе вызначыць мацнейшых у гэтых прадметных абласцях. А майстар-клас «Юныя даследчыкі» садзейнічае ўключэнню вучняў у неспазнаны свет біялагічных, геаграфічных і хімічных навуковых «лабірынтаў», дазваляе даведацца, як вырасціць інфузорыі туфелькі, цэлыя сады крышталёў, стварыць хімічны «вулкан» і г. д.

Навучэнцы X класа, што займаюцца вывучэннем біялогіі, геаграфіі і хіміі на павышаным узроўні, праводзяць неабходныя эксперыменты для напісання даследчых работ. Затым дзяўчаты і хлопцы прэзентуюць сваім аднакласнікам інфармацыю, атрыманую ў выніку даследаванняў, выказваюць свае меркаванні па выкарыстанні вынікаў работы ў паўсядзённым жыцці.

Такім чынам, лагічна прадуманы і творча праведзены тыдзень біялогіі, хіміі, геаграфіі дазваляе кожнаму вучню ўключыцца ў пазнанне таямніц навакольнага свету, вывучэнне біялагічных, хімічных, геаграфічных аб'ектаў, праявіць сваю эрудыцыю.

Фестываль «Залатая восень» арганізуецца з мэтай выхавання цікавасці да вучэбных прадметаў «Біялогія», «Чалавек і свет», фарміравання ў вучняў жадання раскрыць нязведаныя з'явы прыроды, паглыбіць свае веды, паказаць прыгажосць і непаўторнасць роднай старонкі.

У фестывалі, які працягваецца шэсць дзён, прымаюць удзел навучэнцы I—XI класаў. Яны актыўна ўдзельнічаюць у конкурсах чытачоў, малюнкаў, фатаграфій і г. д. Разам з бацькамі дзеці праяўляюць

сваё майстэрства, творчасць, фантазію і са звычайнага прыроднага матэрыялу майструюць цудоўныя вырабы, карціны-кампазіцыі. Так у фае першага паверха школы «пасяляецца» казка з цудоўнымі персанажамі. Незвычайныя і каларытныя кампазіцыі з прыродных матэрыялаў і дароў садоў-агародаў радуюць наведвальнікаў выставы.

«Пад занавес» конкурсу вызначаюцца пераможцы ў розных намінацыях: «Дары восені», «Незвычайныя вожыкі», «Восеньскі букет», «Асенняя фантазія», «Ураджай», «У гасцях у казкі» і г. д. З упэўненасцю можна адзначыць, што такія творчыя конкурсы спрыяюць стварэнню атмасферы добразычлівасці, узаемаразумення, супрацоўніцтва дзяцей, бацькоў, педагогаў. З другога боку, навучэнцы праз разнастайныя творчыя кампазіцыі могуць прадэманстраваць веданне арганізмаў царстваў Пратысты, Грыбы, Расліны, Жывёлы. Для стварэння сваіх шэдэўраў дзеці выкарыстоўваюць прадстаўнікоў голанасенных і пакрытанасенных раслін, імхоў, папарацей, хвашчоў. Сярод прадстаўнікоў жывёльнага свету ў работах навучэнцаў звычайна пераважаюць арганізмы класаў Птушкі і Млекакормячыя.

У цёплай і добразычлівай атмасферы заўжды праходзіць сумеснае літаратурна-музычнае свята «Ходзіць Восень па дарожцы...» для вучняў III—V класаў. Прыгажуня-Восень увесь час здзіўляе сваімі біялагічнымі загадкамі, пытаннямі, рэбусамі. Дзеці пераўвасабляюцца ў казачных герояў, чытаюць вершы, інсцэніруюць урыўкі з казак, праяўляюць свае музычныя, інтэлектуальныя, творчыя здольнасці.

З мэтай развіцця цікавасці да біялогіі для навучэнцаў IX—XI класаў праводзіцца біялагічная віктарына «Што? Дзе? Калі?». Яна праходзіць у форме спаборніцтва двух каманд — «Цыталогія» і «Генетыка». Вучні дэманструюць веды ў галіне біялогіі, эрудыцыю, уменні аргументаваць адказ, даказаць свой пункт гледжання. Віктарына садзейнічае развіццю мыслення, хуткасці рэакцыі, пазнавальнай актыўнасці і інтэлекту. У канцы мерапрыемства навучэнцы прэзентуюць камандныя кампазіцыі «Загадка прыроды», ў якіх праяўляюцца іх фантазія, творчасць, неардынарнасць.

З вучнямі VI—VIII класаў праводзяцца інфармацыйныя хвілінкі «Расліны-драпежнікі», «Цікавыя факты пра расліны», «Што агульнага ў дзьмухаўца і аўтамабіля?». У ходзе гэтых мерапрыемстваў у дзяцей фарміруецца цэласнае бачанне сучаснага свету і ўсведамленне свайго месца ў ім. Яны рашаюць галаваломкі, рэбусы, экалагічныя задачы, атрымліваюць веды аб спосабах аховы прыроды роднага краю.

Для развіцця творчых здольнасцей сямікласнікаў праводзіцца ролевая гульня «Экалагічны суд», якая мае на мэце экалагічнае выхаванне вучня, фарміраванне асобы, што характарызуецца развітой экалагічнай свядомасцю і культурай, беражлівымі адносінамі да навакольнага асяроддзя.

Навучэнцы ўсіх класаў з задавальненнем прымаюць удзел у працоўнай акцыі «Чысты двор», якая прывівае любоў да прыроды, фарміруе пачуццё гонару за родны край, сваю малую радзіму.

